Ба 72988

A132

Ба72988

ПРАГРАМА
Польскай Народнай Партыі
„ВЫЗВАЛЕНЬНЕ“

Бел. аддз. 1994 г.

Друкарня „ДРУК“, Субач, 2.

[1922]

роўнага свабоднага грамадзяніна у Незалежнай Дзяржаве і ёсьць найважнейшай мэтай, да каторай ідзе Народная Грамада „Вызваленьне“!

Паглядзімо цяпер як яна паўстала і як злажыла сваю праграму.

Як паўстала Польская Народная Грамада „Вызваленьне“.

Сумленьне народнае, сьвядомасьць страшэннай крыўды, што забітаму ў працы мужыку робіцца, збудавала Народную Грамаду „Вызваленьне“. Не адразу, а гадамі цэлымі пад лямэнт і скрып людовай нядолі прачыхалася у душы лепшых народных сыноў гэтая сьвядомасьць, гэтае сумленьне і патрэба працы для асьветы на вёсцы. Трэба толькі было якому нашаму грамадзяніну пабыць заграніцай, трэ было нашаму мужыччаму сыну кончыць якую хоць найменшую школу, мала-веле працерці вочы, каб жахануцца ад гэтага пекла нуды і мора сьлёз, у якіх біўся цёмны яго бацька і брат селянін, каб угледзіць гэтую катаргу штодзеннага безпраўнага мужыцкага жыцьця. І вось у душы кожнага гэткага селяніна радзілася патрэба шчырай і цяжкай барацьбы за долю мужыка. З кожным днём было гэткіх людзей больш.

Але не дарма прыказка руская гавора, што „адзін у полі не ваяка“,—барацьбу можна весьці толькі грамадой і чым гэта грамада большая, тым барацьба лягчэйшая і скарэй вядзе да мэты — да вызваленьня мужыка селяніна з путаў нуды і нядолі.

Толькі што ў нядаўнай царскай няволі не адна але аж дзьве дубінкі мужыком нашым апекаваліся: адна царская, а друга—панская. І дзеля тога нельга было перад вайною збудаваць вялікай

і моцнай палітычнай грамады — партыі. Нашыя першыя барацьбісты за зямлю і волю для мужыка перш-на-перш ядналіся толькі ў малыя патайныя гурткі. А калі быў гэтакі гурток яўны, то ў прозьвішча яго і у афіцыяльнай праграме не пісалася нічога, што гаварыла-б а праўдзівай мэце гуртка—а барацьбе за зямлю і права для мужыка: афіцыяльна былі гэта ці коопэратывы, ці якія прасьветныя гурткі, а палітычная барацьба вялася зарганізаванымі у іх людзьмі патайком. Многа найлепшых сялянскіх барацьбістаў пападала у турмы, многія дзесяткамі гадоў гнілі і уміралі па турмах, бо царскія жандары тож ня спалі і старaліся у зародзе задушыць народную волю, а паны нашы «родныя» ім найчасьцей памагалі.

Гэткім чынам малымі самапаснымі гурткамі вялася народная барацьба да вялікай вайны. Ужо пад нямецкай няволяй толькі гэтыя гурткі сталі ядначца і у канцы зьвязаліся ў адну магутную „Польскую Народную Грамаду" і сталі пісаць сваю газэту „Вызваленьне", будзячы гэтакім чынам сваіх бедных забітых у працы братоў-сялян да вызваленьня з путаў вечнай матэрыяльнай бяды і духоўнай цемры.

Але пры гэтым з'еднаньні паказалася, што не ва ўсіх аддзельных гуртох працавалі адзінакія людзі, не ўсе яны ставілі сабе адну мэту і ня ўсе да гэтай мэты—вызваленьня мужыка, роўна цьвёрда йшлі. Нашлося многа людзей у гэтых гуртках, што так быццам і у мужыцкай барацьбе адной рукой памагалі, а другой паноў гладзілі. Ясна, што нашыя шчырыя барацьбісты не маглі міргаць і кланяцца панам і мусілі разыйсьціся з тымі людзмі, што за панамі пашлі, арганізуючы свае гурткі і грамады і заграшаючы мужыкоў у далейшую панскую службу. Гэтыя грамады—партыі,

і жадавіць правоў для беднага працоўнага мужы толькі такіх, каб яго нуда зусім ня здушыла і няпрышоў гэты бедны мужык да гэнага самага кулака па яго багацьце.

Вось пры ўсякай палітычнай працы мусіць працоўны бедны мужык добра разгледзіцца гдзе яго праўда і згадзіцца аддаць свой голас толькі на тую палітычную грамаду (партыю), каторая цьвёрда і шчыра вядзе працоўны народ з бяды і цемры — а гэтакай Грамадой і ёсьць толькі

Народная Грамада „Вызваленьне"!

Каб жа кожны селянін мог запраўдна сваю палітычную партыю знайсьці і да яе запісацца, павінен ён добра пазнаць і ўважаць на праграму кожнай партыі, гэта значыць на тое да чаго і якімі дарогамі якая партыя ідзе і чым яна розьніцца ад іншых.

Як зложылася праграма Народнай Грамады „Вызваленьне."

Праграму кожнай агульнай грамады ўкладае і зацьверджае агульны конгрэс (з'езд) прадстаўнікоў гэтай грамады. Вось і праграму „Вызваленьня" уложылі і ў адзін голас зацьвярдзілі вялізныя конгрэсы прадстаўнікоў „Вызваленьня" з 1918 і 1921 г.

Вось чым розніцца гэта праграма Народнай Партыі „Вызваленьня" ад праграмаў іншых палітычных грамад.

Ня трэба хіба гаварыць што нас дзеліць ад панскіх палітычных грамад: „Związku Ludowo-Narodowego" і „Narodowego Zjednoczenia Ludowego": яны хочуць здушыць мужыка ў бядзе і ў цемры,

мы-ж змагаемся з імі за зямлю, права і асьвету для мужыка. У нас іншыя мэты і іншыя дарогі: нам тром ня будзе па дарозе.

Затое цяжэй распазнаць тое, што дзеліць нас з тымі і мужыцкімі грамадамі, але каторыя ніколі не парвуць сваей лекайскай услужлівасьці да паноў, бо яна добра аплачываецца, гэта значыць, з „Polskim stronnictwem Ludowym „Piast" і „Radami Ludowemi."

Вось глаўнае наша змаганьне, каб праграма наша ня была толькі на паперы, а як найшыбчэй ўвялася у жыцьце. Да таго патрэбна ясная цьвердая дарога і мураваные людзі, каб роўна ня хістаючыся ў бок і не кланяючыся паном ішлі яны да вызначанай мэты, чаго не маюць ні „Piast" ні „Рады Людовыя"

„Вызваленьне" зрадзілася з цяжкай працы і катаржнай нядолі вясковага мужыка і дзеля таго шануе працу і шчыра змагаецца за долю кожнага працоўнага народу ня гледзячы якой ён веры ці нацыянальнасьці. Вызваленьне шчыра шануе ўсе народныя скарбы мужыцкай душы і дзеля таго дамагаецца роўнага права для ўсіх жыхароў дзяржавы — права кожнага народу свабоднага разьвіцьця і уставаньня сваей мовы і веры як у школе, так у царкве ці касьцёле. Дзеля таго „Вызваленьне" змагаецца проці ўціскаиьня іхных школаў, коопэратываў і другіх нацыянальных арганізацый.

Уважаючы зямлю за найважнейшую падваліну народнага жыцьця і багацьця „Вызваленьне" дамагаецца перадачы усей зямлі працоўнаму народу, каторы адзін мае права на яе, бо толькі ён на ёй працуе. Ведаючы што грамадная большасьць зямлі ў Польшчы як і у нас знаходзіцца ў руках паноў, „Вызваленьне" вядзе вострую барацьбу

проці таго што дзеляць зямлю паміж прывезеных здалёк жыхароў, а мейсцовыя малазямельныя і беззямельныя мужыкі астаюцца без зямлі. Вось мы дамагаемся, каб зямля кожнага маёнтку была падзелена перш-на-перш паміж малазямельнымі, беззямельнымі і тутэйшым жаўнерам найбліжэйшых вёсак.

Дзеля таго што на „крэсах“ знаходзіцца шмат больш зямлі да падзелу, як у Польшчы, могуць тут даставаць зямлю і жаўнеры з Польшчы, толькі каб праз тое ня былі пакрыўджаны тутэйшыя сяляне і жаўнеры, бо яны да гэтага маюць першае права. Мы прымаем за правіла, каб жаўнеры дасталі сваю зямлю перш з таго маёнтку каля сваей роднай вёскі, гдзе бацькі яго рабілі паншчызну і ён працаваў цэлы век, бо гэтак і вёска жадная пакрыўджана ня будзе і жаўнерам лягчэй будзе загаспадаравацца каля сваей хаты. Мы змагаемся за тое, каб ад гутарак ды пісаньня зямельнай рэформы Урад наш перайшоў да праўдівай работы на полі, каб стаў ужо скарэй дзяліць зямлю. „Вызваленьне“ жадае скасаваньня усіх „парцэляцыйных спулак“ каторыя выскупляюць і распрадаюць зямлю і без таго багатым людзём.

„Вызваленьне“ жадае, каб лясы усе панскія забрала гаспадарства.

Вось з гэтым усім ня годзіцца „Piast“ і „Rady Ludowe“ і хоць іх адзін правадыр Вітос і быў цэлы год старшынёю ураду, хоць другі іх правадыр—Кернік, пастаўлены на тоя, каб дзяліць зямлю перш-на-перш паміж бяднейшых мужыкоў, то аднак абодва яны нічога добрага для працоўнаго народу не зрабілі—зямля ня дзеліцца і распрадаецца панамі і спулкамі, лясы паны рубаюць і вывозяцца да цна, а на акраіны гаспадарства—

на крэсы вязуць усё больш жаўнераў з Польшчы. Вось як ашуківаюць мужыкоў панскія лекайскіе грамады—„Пяст“ і „Рады Людовыя“, с каторымы як з панамі „Польская Народная Грамада Вызваленьне“ вядзе вострую барацьбу.

Няхай жа кожны селянін у кожным палітычным моманце добра разгледзіцца серад грамад, каторыя будуць яго зваць, няхай не дасьць абмануцца паном і іх лекаем і туліцца пад сьцяг Польскай Народнай Грамады „Вызваленьне“, каторая адна толькі цьвёрда йдзе да вызваленьня працоўнага Народу з бяды, зьдзеку і цемры на дарозе, каторая выразна апісана на далейшых страніцах праграмы.

Програма P. S. L. “Wyzwolenie” Польскай Народнай Грамады „Вызваленьне“.

У барацьбе за праваджэньне у жыцьце нашай палітычнай, грамадзянскай, гаспадарчай, прасьветнай і маральнай праграмы, нашай рабоце пры будаваньні народнага жыцьця у Незалежнай Польшчы сьвецяць думкі духоўных павадыроў нашага народу, якія апавяшчалі, што „мэта жыцьця—робіцца шляхотным“..., а „асновай грамадзкіх перамен есьць характар адзінак“.

Палітычныя мэты.

1. Польская народная партыя „Вызваленьне“ ўтварылася дзеля вызваленьня нашай Бацькаўшчыны спад панаваньня напастнікаў і спад панаваньня разгаспадарыўшыхся цёмных сіл — вось адгэтуль яе назова. Цяпер галоўнай мэтай нашай партыі ёсьць умацаваньне і абарона незалежнасьці Польшчы, наладжываючы ў ёй урад узпраўды народны.

2. Польская Дзяржава павінна абняць усе зямелькі, на якіх большасьцю жыхароў ёсьць Палякі. Калі-б нават варожая сіла адарвала ад Польшчы якуюсь зямельку з іх насяленьнем цалком, або ў сваей большасьці польскім, дык ніякія падпісаныя пад прымусам дагаворы, ніякія іншыя прычыны ня здолеюць нас забыцца аб лёсе нашых братоў, каторыя хочуць з намі жыць і працаваць.

3. Тое няпольскае насяленьне, якое, з прычыны вялікага нацыянальнага пераблутаньня на акрайнах, апынецца ў межах Польскай Дзяржавы, павінна карыстацца ў разьвіцьці свае нацыянальнае культуры ўсялякай свабодай і магчымымі найвялікшымі падмогамі ў школах, урадовых установах і судох для карыстаньня з свае мовы, а там, дзе яно сядзіць больш густой масай, павінна мець тэрыторыяльную аўтономію.

4. З усімі сваймі суседзямі Польшча павінна старацца жыць дружна і згодна. Асабліва з дзяржавамі, якія ўтварыліся на руінах дзяржаў некалі нас падняволіўшых, павінны зьвязываць нас адносіны з брацкім спогадам, а з дзяржавамі, якія ляжаць на абшары колішняга Князьства Літоўскага, самая блізкая лучнасьць. Аднак ніводнай згэтых дзяржаў Польшча не павінна ані сваей дружбы, ані лучнасьці з сабой накідаць гвалтам. Ня будзе ўзапраўды вольны той, хто не патрапіць шанаваць чужую волю.

5. Народная Польшча ня можа быць захватнай дзяржавай. Дзеля гэтага мы не ўспамагалі ні ў якой вайне, распачатай імем няпэўнай карысьці для нашай дзяржавы, бо вайну мы лічым няшчасьцем і сорамам чалавецтва; а тым барджэй мы ваража адносімся да вайны, якая вядзецца за абарону інтарэсаў нейкай клясы: землеўласнікоў, банкіраў, багатыроў. Аднак-жа, баронючы неза-

лежнасьці Бацькаўшчыны, мы гатовы заўсёды аддаць сваё жыцьцё і сваю маемасьць, як мы дагэтуль рабілі.

6. Пры цяперашніх міжнародных адносінах, пры якіх людзі ўпраўляюцца, на жаль, не справядлівасьцю, а сілаю, мы бачым безумоўную патрэбу ўтрымоўваць пастаяннае войска для абароны Польшчы. Але хочам, каб наша армія ўзапраўды была абаронцам Бацькаўшчыны, а не падпорай рэакцыі, гатовая да паліцэйскай службы і задзіраючая нос у гару перад іншымі грамадзянамі. Самай лепшай абаронай старонкі будзе распаўсюджваньне вайсковай навукі сярод народу і навучаньне яго дзействаваць аружжам у стралецкіх арганізацыях. Вайсковая служба павінна быць абмяжавана працягам часу, які патрэбны, каб вышкаліваць навабранца. Усе грамадзяне, бяз ніякой рожніцы на ваеннай службе павінны карыстацца правамі вольных і роўных грамадзян, апрача тых выпадкаў, калі служба вымагае інакш.

7. Польшча павінна быць Рэспублікай, а дзеля таго што самай галоўнай і нявычэрпанай крыніцай, з якой можна браць сілы, каб узмацаваць яе дужасьць, ёсьць грамадзянскае пачуцьцё працоўнага народу, мы хочам стварыць для гэтага народу ўмовы найхутчэйшага і самага ўсестаронь-няга разьвіцьця. Дзеля гэтага Польшча павінна быць Рэспублікай народнай. З уселякімі спробамі ўвесьці ў Польшчы манархію або ўтварыць дыктатуру будзем энергічна змагацца.

8. Ядынай крыніцай уселякай у дзяржаве ўлады павінна быць воля ўсяго народу, высказаная агульным, роўным, тайным, безпасрэдным і прапарцыянальным галасаваньнем. Мы будзем існці да таго, каб народная воля магла праяўляцца ня толькі выбарамі ў Сойм, але па магчымасьці

безпасрэдна, ясна і рашуча, ці раючыся з народнай думкай у важнейшых справах (referendum), ці праз выбары судзей ды ўраднікаў. Каб ляпей была вядома народная воля, працяг пасольскага мандату павінен быць па магчымасьці карацейшы —2 да 3 гадоў; а калі-б у Сойме пачаліся вялікшыя непаразуменьні між партыямі, дык павінны быць зробляны новыя выбары.

9. Ядынай законадаўчай установай павінен быць Сойм аднапалатны. Мы будзем рашуча змагацца з накіданьнем Польшчы сэнату, ці ў форме палаты паноў на чале з вірылістамі-біскупамі, ці ў мягчэйшай форме Старожы Законаў або Сэнату з агульных выбароў. Засьцярагчы Сойм ад памылак можа толькі статут, які Сойм сам для сябе напіша.

10. Начальніка Дзяржавы (Прэзыдэнт Рэспублікі) павінен безпасрэдна выбіраць увесь народ, дзеля таго што выбары праз законадаўчыя ўстановы не давалі-бы гэтаму прадстаўніку Дзяржавы патрэбнай павагі і давялі-бы да партыйнай калатні.

11. Мы лічым, што адно з самых важных пры будаўніцтве Польскай Дзяржавы ёсьць шырокае разьвіцьце самаўпраўленьня, па магчымасьці самастаяцельнага ў адносінах да бюракрацыі. Разьвіваючыся нармальна і свабодна, самаўпраўленьне прывядзе нас да безпасрэднага народнага ўраду. Дзеля таго мы будзем усімі сіламі старацца, каб з аднаго боку пашырыць сярод насяленьня зразуменьне патрэбы самаўпраўленьня навучыць насяленьне карыстацца ім, вытварыць здольных працаўнікоў у напрамку самаўпраўленьня, а з другога боку каб абмежаваць дагляд урадавай улады да самых неабходных разьмераў. Найблізшыя нашы мэты на шляху разьвіцьця самаўпраўленьня ёсьць: аддаць кіраваньне соймікамі і

ваеводзкімі радамі старшыням выбарным, адабраць ад адміністрацыйный ўлады права зацьверджаць або адкідаць выбары старшынь урадаў самаўпраўленьня, увесьці ваеводзкае самаўпраўленьне, зрабіць адкрытымі паседжаньні ўрадаў самаўпраўленьня, абапёрці ўрады самаўпраўленьня на агульных, тайных, беспасрэдных ды прапарцыянальных выбарах і даць магчымасьць самаўпраўленьням супрацiўляцца, каб ім накідалі старостаў і ваеводаў.

12. Будзем з усіх сіл змагацца, пакуль зусім справа не паправіцца, каб не было службовай няздольнасьці, злой волі і несправядлівасьці з боку ўраднікаў. Будзем падтрымоўваць толькі такі ўрад, які добра аплачваючы ўраднікаў, разам з гэтым зьменьшыць іх лік, а галаўным чынам устрымае іх ад кепства і навучыць іх, што дзяржава павінна быць апякуном і падмогай у разьвіцьці гаспадарчага і культурнага жыцьця, а не яго прыгнетальнікам і ворагам.

Грамадзянін, які будзе скрыўджаны несправядлівасьцю, злой воляй або службовай няздольнасьцю ўрадніка, павінен мець аблягчонную магчымасьць падаць яго ў суд за свае крыўды і страты. Абвінавачаны ўраднік ня можа апраўдывацца загадам свайго начальства. Асабліва строга павінны быць пакараны ўраднік і судзьдзі, якія трымаюць грамадзян у турме без дай прычыны, або не даводзячы справу да суда. Прынцыпова будзем ісьці да таго, каб не было кары сьмерці. Будзем старацца, каб запанаваў прынцып выбіраць ураднікаў, перадаусім пакуль-што судзьдзей, калі гэта будзе магчыма.

13. Абарону правоў чалавека і грамадзяніна ў Польшчы лічым аднэй з першых мэтаў нашай партыі. Ніхто ня можа быць скрыўджаны ў

сваіх грамадзянскіх правох дзеля свайго стану, веры, або нацыянальнасьці, а дык-жа крыўдна, калі закон або звычай дае вялікшыя правы іншаму стану, іншай рэлігіі або іншай нацыянальнасьці. Будзем старацца, каб жанчыны мелі поўную волю распараджацца сваею маемасьцю.

14. Ані дзяржава, ані палітычныя партыі не павінны мяшацца ў справы веры, дзеля таго што гэта ёсьць справы сумленьня кожнага з грамадзян. А затое духавенства павінна ўстрымоўвацца ад ўведзеньня палітыкі ў касьцёл, на амбону і да спавядальніцы. Калі народу цяжка адрожніць духоўную асобу, якая мае быць яго духоўным павадыром, ад духоўнага асобы, якая зьяўляецца яго палітычным праціўнікам, дык самае справядлівае, каб духоўныя асобы ня мелі права быць пасламі і служыць у урадах самаўпраўленьня. Каб не было, як гэта цяпер здараецца, зьдзірства за духоўную службу, дык павінна быць плата ўстаноўлена па паразуменьні парафьяльных радаў з духоўнымі асобамі.

Аддзел прасьветы.

Школьная справа.

15. Пашырэньне сярод народу асьветы мы лічым бязумоўна патрэбным і дзеля таго, каб даць яму магчымасьць мець належны палітычны ўплыў у дзяржаве, і дзеля таго, каб ён спаўняў свае абавязкі ў аднашэньні да Польшчы. Навука і выхаваньне павінны мець на мэце дасканаліць чалавека ды рабіць з яго добрага грамадзяніна. Апроч таго школа павінна быць для моладзі асяродкам

культуры, грамадзянскага выхаваньня і падгатоўкай да працы.

16. Мы йдзем да таго, каб увялася ў жыцьцё школа агульная (паўшэхная), ядыная для ўсіх дзяцей бяз рожніцы стану, нацыянальсьці і веры. Гэткая школа разам з тым павінна быць падставай для школы сярэдняй і прафэсыянальнай.

17. Навука павінна быць бязплатнай на ўсіх ступенях і ўва ўсіх тыпах школ. Дзецям здольным а бедным дзяржава павінна забяспечыць спосабы ўтрыманьня праз увесь час навукі ў школе сярэдняй, вышэйшай і прафэсыянальнай.

18. Асаблівую увагу мы зьвяртаем на тое, каб адчыняць дзяржаўныя і грамадзкія прафэсыянальныя школы (сельска-гаспадарчыя, рамесьленыя і г. п.)

19. Адным з самых неадкладных заданьняў Дзяржавы мы лічым уведзеньне агульнага навучаньня, і будзем ісьці да таго, каб як найхутчэй была ўведзена ўстава аб збудаваньні агульных (паўшэхных) школаў. Школьны абавязак павінен абняць 7 гадовую школу агульную ды навуку дадатковую агульную або прафэсыянальнаю да 18 гад. жыцьця ўлучна.

20. Будзем старацца, каб навучаньне не абніжалася праз тое, што лекцыі выкладалі-бы непадгатаваныя да гэтага сілы. Уладжэньне мінімум праграмы вучэньня, а так-сама дагляд над спосабамі навучаньня і выхаваньня належаць да дзяржавы.

21. Вучонасьць вучыцельства павінна быць як найвышэйшай. Вучыцельства агульных школ павінна мець гэтакую самую навуковую і пэдагагічную падгатоўку, як і вучыцялі сярэдніх школ ды такі-ж самы як яны статут датычна службовых адносін і аднолькавую з імі пэнсыю.

22. Грамадзянства павінна дапамагаць развіцьцю школьнае справы, прыймаючы ўчасьце ў радах і даглядах школьных, якіх мэтай ёсьць здаваліваньне гаспадарчых патрэб школы ды ініцыятыва і учасьце ў закладзінах і ўтрыманьні школ, а так-сама апека над дзяцьмі і школьнай моладзьдзю. Ідучы да разьвіцьця і ўзмацаваньня самаўпраўленьня, лічым канешна патрэбным замену аддзельных урадоў і даглядаў на аддзелы валаснога і павятовага самаўпраўленьня.

23. Дзеля дзяцей ад 3 да 6 гадоў павінны быць наладжаны прыпынкі з падмогай дзяржавы.

Зашкольная асьвета.

24. Каб хутчэй усьведаміць народныя масы з грамадзкага боку і разьвіць нацыянальную культуру, мы ўсімі сіламі падтрымоўваем пашыраньне культуры і асьветы паміж сталымі людзьмі, наладжываньнем агульна-выхаваўчых і спэцыяльных курсаў, чытальняў, выстаўкаў, музэяў, народных тэатраў і г. п. Будзем старацца, каб зашкольную асьветную працу падняць як мага вышэй і каб даручаць яе людзям, падгатаваным да гэтага.

25, Зашкольнай асьветай як найшырэй павінны заняцца самаўправленьні праз залежных ад іх культурна-асьветных інструктараў. Мэтай дзяржаўнай дапамогі павінна быць падняцьце навучнай і тэхнічнай працы, якую распачынаюць грамадзкія групы, і грамадзкай ініцыятыве павінна быць пакінена поўная свабода дзейства, даючы ёй грашовую падмогу. Кружкі і дзеячы нашай партыі так-сама павінны ўсімі сіламі старацца, каб закладаліся асьветныя таварыствы, бібліятэкі народных дамоў і г. п.

Сельска-гаспадарчая асьвета.

26. Лічым неабходным, каб у кожным павеце ўтвараліся асяродкі сельска-гаспадарчай культуры ў пастаці сельска-гаспадарчых школ, курсаў і прымерных гаспадарак. Будзем усімі сілаі дапамагаць у пашырэньні сельска-гаспадарскай асьветы арганізуючы таварыствы, кароткасрочныя сельска-гаспадарчыя курсы, лекцыі, інструктары, выстаўкі, экскурсы і т. д.

Гаспадарчая праграма.

Крыніца багацьця.

27. Будзем старацца падняць багацьце Польшчы, бо багацьце дасьць нашай Бацькаўшчыне моц і незалежнасьць ад іншых дзяржаў і дасьць магчымасьць разьвіваць уласную культуру.

Крыніцамі багацьця Польшчы хочам каб былі: праца ўсяго грамадзянства, павышэньне працаздольнасьці кожнага з грамадзян і адпаведнае зарганізаваньне грамадзянства.

28. У цяперашнім новым пэрыядзе жыцьця нашага народу мы павінны мець сваю ўласную гаспадарчую праграму, якую дзяржава, г. зн. сойм, і ўрад апрацуюць і будуць праводзіць у жыцьцё разам з народам. Абавязак дзяржавы распачынаць утварэньне новых галін гаспадарчае працы і дапамагаць іхняму разьвіцьцю, апрача таго даглядаць, каб паўстаўшая прамысловасьць здавалівала патрэбы грамадзянства. Будзем аднак старацца, каб дагляд дзяржавы не пераходзіў самых патрэбных межаў і не ставаўся цяжкім, а так-сама, каб грамадзянства не апіралася на адну толькі ўрадовую помач і ўрадовыя пачынаньні.

29. Пры наладжываньні прамысловасьці дзержава павінна перш-на-перш падтрымоўваць тыя яго галіны, якія абаперты на натуральных багацьцях старонкі, а перад усім тыя, якія зьвязаны з глебай, гэтак, каб галоўная крыніца нашага багацьця—праца земляроба, як мага хутчэй была даведзена да самай вялікай вытворчасьці і найляпей аплачвалася. Павінна наладзіцца і прамысловасьць, якая-бы ператварыла ўсе плады нашае зямлі, і такая, каторая дастаўляла-бы земляробу ўсе патрэбныя прылады: сельска-гаспадарчыя машыны, гной і г. п.

Коопэратывы.

30. Разьвіцьцё і багацьце Польскае Дзяржавы хочам абапёрці перадаўсім на дробных, але прыгодных каб пракарміць сямью гаспадарках, якія зьяўляюцца ўласнасьцю занятых на ёй земляробаў. Аднак хочам узмацаваць іх сілу і вытворчасьць, зьвязываючы іх коопэратыўнымі арганізацыямі, а гэта дасьць магчымасьць навет самым найменшым гаспадаркам карыстацца найляпейшымі тэхнічнымі прыладамі. Дык вось мы будзем шмат увагі зьвяртаць на разьвіцьце коопэратываў: распаўсюджваць зразуменьне і пашану коопэратарскае працы, успамагаць паўставаньню і нармальнаму разьвіцьцю ўселякай коопэрацыі, пачынаючы ад спажывецкіх, а канчаючы вялікімі коопэратывамі, якія твораць прамысловасьць, глаўным чынам зьвязаную з сельскай гаспадаркай. Будзем ісьці да таго, каб фінансаваньне дробнага земляробства і зьвязанай з ім прамысловасьці народ узяў у свае рукі, утвараючы грашовыя кооператывы з вялікім Народным Банкам на чале.

Дзяржаўнае і грамадзкае ўладаньне

31. Узяўшы пад увагу, што адным з найвялікшых багацьцяў Польшчы—ёсьць схаваныя ў зямлі скарбы: газа, вугаль, жалеза, соль і г. п. павінны быць уласнасьцю усяго народу, будзем ісьці да таго, каб дзяржава мала-па-малу пераймала шахты ў свае рукі або аддавала іх коопэратывам.

32. Дзеля таго што ёсьць вялікая патрэба штучнаго гною каб адбудаваць земляробства, дзяржава павінна дапамагаць паўставаньню фабрык гною, асабліва тады, калі будуць наладжывацца коопэратывы, а апрача таго дзяржава павінна мець дагляд, каб вытвараныя фабрыкамі гноі былі добрага сорту.

33. Дзеля таго што электрычная сіла і сьвет маюць вялікае значэньне як для прамысловасьці, так і для дробнае сельскае гаспадаркі, дзяржава павінна як мага хутчэй апрацаваць плян электрыфікацыі ўсяго краю і правесьці яго ў жыцьцё, заклікаючы да працы самаўпраўленьні і вясковыя грамады. Пакуль-што часовыя дазволы (канцэсыі) павінны выдавацца гэтак, каб гэты паасобныя прадпрыемствы пасьля не псавалі агульнага пляну.

34. Чыгункі і дарогі водныя павінны быць уласнасьцю дзяржавы. Тое самае датыча фабрык аружжа і амуніцыі.

35. Будзем ісьці да таго, каб была праведзяна ў жыцьцё пастанова сойма 10. VII. 1919 г. аб дзяржаўнай прыналежнасьці лясоў.

36. Прыцягваючы ў Польшчу патрэбныя дзеля хутчэйшай адбудовы краю заграпічныя капіталы, урад павінен старацца, каб капітал краёвы, першым чынам дзяржаўны або грамадзкі, меў у супольцы з заграпічным капіталам перавагу.

37. Урад павінен як найхутчэй старацца ўстанавіць бюджэтную роўнавагу, г. зн. зрабіць так, каб дзяржаўныя расходы пакрываліся не друкаваньнем грошай і пазыкамі, але падаткамі. Аднак рашуча будзем заўсёды змагацца з тым, каб бюджэт апіраўся на немаральных крыніцах, як напр. на даходзе ад алькаголю.

38. Падаткі павінны першым чынам прыціснуць самыя дужыя сьпіны: спэкулянцкі і банкірскі капітал, вялікія даходы і вялікія капіталы. Падаткі павінны быць безпасрэдныя і паступовыя, г. зн. што павінны павялічвацца разам з павялічэньнем даходу або маемасьці.

39. Будзем дамагацца новай клясыфікацыі грунтаў пры ўстанаўленьні зямельнага падатку.

Міжнародныя адносіны.

40. Калі польскі ўрад будзе падпісваць з іншымі дзяржавамі гандлёвыя дагаворы, мы будзем сачыць, каб Польшча не сталася полям эксплёатацыі для заграмічных капіталістаў і каб дагавор не лёг сваім цяжарам галоўным чынам на плечы народа.

P. S. L. «Wyzwolenie», бярэ на сябе абарону інтарэсаў меншай зямельнай уласнасьці, калі будуць падпісвацца таможанныя трактаты між дзяржавамі, вызначацца плата за перавозку сельскагаспадарчых прадуктаў па чыгунцы або водным шляхам.

Абарона працы і апека над бяззямельнымі і эмігрантамі.

41. Працаўнікам, якія ня маюць свайго ўласнага варштату працы, будзем старацца дапамагчы

знайсьці патрэбнае ўтрыманьне і магчымыя ўмовы працы спосабам законадаўчым і прафэсыянальным рухам. Асабліва будзем змагацца з непасільвай працай і эксплёатацыяй дзяцей і жанчын.

Пастаноўлена 12 чэрвеня 1916 г.

1) Дзеля таго што ўва ўсіх справах і непаразуменьнях працадаўцаў з земляробамі работнікамі гэтыя апошнія пакінуты сваеволью працадаўцаў—P. S. L. „Wyzwolenie" бярэ іх пад апеку і дае ім падмогу ў прафэсыянальнай арганізацыі. Дык вось P. S. L. будзе старацца:

а) усюды ўвесьці абавязковыя кантракты між працадаўцамі і земляробамі (парабкамі);

б) увесьці абавязковыя палюбоўныя суды і камісіі згоды ў справах непаразуменьня між землеўласьнікамі і парабкамі;

в) увесьці абавязковыя страхоўкі ад хвароб няшчасных здарэньняў і няздольнасьці да працы а так-сама старасьці — з учасьцем дзяржавы і працадаўцы;

г) забасьпечыць доктарскую апеку, ахрону працы кабет і дзяцей, спыніць г. наз. „пасылак".

д) будзе старацца ўрэгуляваць дзень работы;

е) спыніць і палепшыць немагчымыя, цесныя і мокрыя кватэры, якія зьяўляюцца крыніцай усялякіх заразных хвароб.

2) Дзеля таго, што няволя перашкаджала гаспадарчаму разьвіцьцю польскіх зямель, а польскае насяленьне было прымушана дзеля кускa хлеба ехаць заграніцу, дзе цярпела паняверку,— P. S. L. будзе старацца аблягчыць долю ўцекачоў, бараніць іх ад дэнацыялізацыі, а давёўшы край да разьвіцьця як сьлед — паможа ім вярнуцца ў род-

ную старонку і знайсьці патрэбныя для пражыцьця заработкі.

Зямельная праграма.

42. Каб павялічыць унутраную моц Польшчы, падняць гаспадарчы і культурны быт аграмаднай масы селянства, каб спыніць эміграцыю, да якой прымушае бяда, а так-сама каб аздаравіць і падняць зямельную вытворчасьць у Польшчы—канечна трэба зямлю перадаць у рукі народу, які на ёй працуе. Гэта патрэба прызнана Соймам ува ўсей сваей разьцягласьці. Пастанова 10 ліпня 1919 г. аб асновах зямельнае рэформы—гэтая вялікая пабеда народнай ідэі—кладзе падставу пад будоўлю рэформы. Акуратнае выкананьне гэтай пастановы, праўдзеньне ў жыцьцё гэтых крічаў, здабытых у цяжкай барацьбе народу—будзе самай першай мэтай працы P. S. L. „Wyzwolenie".

43. У падрабязнасьці будзем ісьці да таго, каб:

а) хутка былі спынены перашкодныя адхілы ад пастановы 10 ліпня, якія ў выканаўчых пастановах да зямельнае рэформы накінулі правыя партыі;

б) былі напісаны патрэбныя законы аб зямельным банку, аб пераходзе на дзяржаўную ўласнасьць лясоў, заснаваньне гіпотэкі дробнай уласнасьці;

в) наладзілася простасьць і хуткасьць у дзеяльнасьці установ, якія праводзяць зямельную рэформу, праз найшырэйшую дэцэнтралізацыю працы Зямельнага Ураду, пазбавіўся ён бюрократычнага характару і меў у большасьці спраў рашучую ролю, а не дарадчую Пав. Зям. Кам., а адначасна каб была павышана павага і дзеяльнасьць Валастных Камісій ды пераменяны спосабы іх выбараў.

44. Калі ніякая частка старонкі не павінна быць пазбаўлена зямельнае рэформы ў поўнай яе шырыні, дык мы будзем старацца, каб аграніччэньні зямельнай рэформы датычна Пазнаншчыны і Акраінаў, уведзеныя Соймам на пераходны час, былі як найхутчэй спынены.

45. Моцна стоячы на тым становішчы, што зямельная рэформа апрача свайго значэньня гаспадарчага мае вялізнае палітычнае значэньне, умацоўваючы цесную і безпасрэдную сувязь між грамадзянамі краю і дзяржавай—мы ня можам дапусьціць, каб карыснасьць зямельнае рэформы ставалася прынадай у руках спэкулянцкіх або партыйных парцэляцыйных прадпрыемстваў. Дзеля гэтага будзем дамагацца, каб была зроблена забарона прыватнай парцэляцыі, гэткім спосабам не даючы магчымасьці рабіць партыйную шкодную для дзяржавы работу, а так-сама перашкаджаючы таму, каб сялянскія грошы, заплачаныя за зямлю, замест таго, каб дапамагаць у наладжэньні гаспадарак, заснаваных дзякуючы зямельнай рэформе, плылі ў кішэнь дасюлятніх землеўласьнікаў і няпрошаных пасрэднікаў.

46. Перабудаваньне зямельнага ладу ў Польшчы, як галоўная работа ў межах зямельнай вытворчасьці, павінна адпаведна зьмяніць і пахіліць да сваіх патрэб усялякую іншую робленую ўрадам працу пры павышэньні сельскай гаспадаркі. Далей ня можа быць гэткі парадак, каб дзяржава грамадзкімі грашмі ўспамагала сельска-гаспадарчыя варштаты, якія павінны счэзнуць, г. зн. вялікую зямельную уласнасьць. Дзеля таго безупынна будзем дамагацца, каб дзяржаўная дапамога давалася толькі такім гаспадаркам, на якіх новы зямельны лад заўсёды будзе апірацца. Уселякія ўспамагальныя ўстановы наладжываемыя дзяржа-

вай або такія, якія атрымоўваюць грошы з казны, як: дасьведчальныя полі, прымерныя фэрмы і г. п. а так-сама ўселякія прафэсыянальныя сельска-гаспадарчыя школы ды гандлёвыя ўстановы, якія патрэбны для сельскай гаспадаркі, павінны быць дапасоўваны для абслужываньня новай формы сельскіх гаспадарак.

47. Згодна з прынцыпам, што ўселякая вялікшая грамадзкая перароблка, знакам тым і зямельная рэформа можа быць зроблена толькі сіламі ўсяго народу—мы будзем безупынна дапамагаць і супрацоўнічаць з урадам, які пачне ўзапраўды праводзіць у жыцьцё зямельную рэформу. Гэтая помач і супрацоўніцтва будзе выказвацца ня толькі палітычным удасьцем у камісіях і ўрадовых установах тамака, дзе прадстаўнікі народу павінны мець голас, але так-сама сьведамым і рашучым змаганьнем са спробамі землеўласьнікаў і спакулянтаў разьбіць лучнасьць народу, спакушаючы паасобныя адзінкі дзікай парцэляцыяй.

Важнейшыя пункты Соймавой Пастановы 10 ліпня 1910 г.

Каторыя мы прыймаем як прагр. P.S.L. „Wyzwolenia"

Рэгулятарам карыстаньня зямлёй у Польшчы згодна з ст. 1 будзе Дзяржава, якая дзеля гэтага павінна мець у сваім распараджэньні патрэбныя абшары зямлі для калёнізацыі і парцэляцыі.

Абшары зямлі для парцэляцыі складаюцца з гэтакіх:

а) абшары, якімі валадае Дзяржава (казённыя і маёрацкія),

б) занятыя Дзяржавай абшары, якія раней належалі да царскай фаміліі або іхніх сяброў,

в) абшары расейскага „Крэсьцьянскага“ Банку і Нямецкай Калёнізацыйнай Камісіі,

г) абшары біскупскія, капітульныя, манастырскія, плебанскія і гд.

д) непарцэляваныя абшары, астаўшыяся пасьля духоўных асоб і пасьля манастыроў,

ж) абшары, купленыя ў час вайны з нячыстых даходаў і абшары асоб, якія спэкулююць зямлёй,

з) зямельныя маемасьці, або іх часьціны, купленыя ад прыватных зямляўласьнікаў на падставе законнага прымусу па цане, вызначанай законам, калі будзе разьвівацца парцэляцыя. Пры выкупе будзе гэтакі парадак, што раней будуць парцэлявацца маёнткі, дзе дрэнна вялася гаспадарка, або зьнішчаныя вайной і маёнткі, у якіх ня ўладжана сэрвітутная справа.

Закон забясьпечыць зямляўласьніку права затрымаць пры сабе толькі адзін забудованы фальварак, на якім ён або яго сямья гаспадараць, пры гэтым сямья да 1 студня 1919 г. не падзеляная будзе лічыцца як адзінка.

Прынцыповае максімум індывідуальнага валаданьня, якое не падлягае прымусоваму выкупу, павінна быць вызначана законам для паасобных вокругаў у разьмеры 60—180 гэктараў (105—315 маргоў). Самая маленькая цыфра датычыцца прамысловых і прыгарадзкіх вокругаў.

Маёнткі, у якіх блага вялася гаспадарка і гэткім чынам яны прыносілі страту для краёвай вытворчасьці, падлягаюць поўнаму прымусоваму выкупу. Дзяржава, вытворчыя сельска-гаспадрскія сувязі і воласьці могуць наладжываць сваю гаспадарку на абшарах, якія займаюць больш за 300 маргоў.

Усе лясы, незалежна ад таго, да якой з памянёных катэгорыі маемасьцяў яны належаць — апра-

ча валастных лясоў і невялічкіх прыватных абшараў, якія нягодны для дзяржаўнае гаспадаркі —стаюцца дзяржаўнай уласнасьцю пасьля зьліквідаваньня сэрвітутнай справы.

Здабыты гэткім чынам запас зямлі (апрача грунтаў, аб якіх гутарка ў пункце 5 і 11) дзяржава будзе раздаваць, каб тварылася як найбольш новых самастойных гаспадарак, прызначаных для беззямельных, дзеля адпаведнага павялічэньня сумежных бедных гаспадарак, а так-сама дзеля прадажы іншым малазямельным.

Пастаноўлена 1 лістапада 1918 г.

Вялікая маемасьць павінна быць адабрана ад яе ўласьнікаў за плату паводле ацэнкі. Аднак пры надта вялікіх абшарах ня трэба плаціць усіх грошай.

Зямля павінна быць аддадзена гаспадарам на ўласнасьць на доўгалетнюю аплату праз Урадовую Установу (Зямельны Банк), якая адначасна павінна выдаваць пазыкі на будаваньне і наладжэньне гаспадаркі.

Дзяржава павінна наладжываць гаспадаркі для сельска-гаспадарчых коопэратыўных грамад.

Пастаноўлена 12 чэрвеня 1916 г.

Асабліва горача P. S. L. „Wyzwolenie“ будзе бараніць родную зямельку ад пераходу яе ў чужацкія рукі.

P. S. L. „Wyzwolenie“ будзе старацца падняць як мага вышэй вытвараемасьць нашых сельскіх гаспадарак, папраўляючы ўселякія недахваты і кепства, якія перашкаджаюць разьвіццю гаспадаркі,—

дзеля гэтага будзе вымагаць ад дзяржавы і старацца способам самапомачы:

а) каб былі злучаны раскінутыя ў сялянскіх гаспадарках грунты і разьдзеляны супольныя грунты;

б) каб была наладжэна способам самым карысным для дробных сельскіх гаспадароў справа сэрвітутаў пасьвішных і лясных;

в) каб была падмога паправіць грунт надта мокры або за шмат сухі адпаведнай мэліорацыяй (палепшаньнем);

г) каб былі ўтвораны гэткія ўмовы, якія не давалі-бы магчымасьці гаспадаркам разьвівацца на частці;

д) каб усюды былі праведзяны добрыя дарогі, якія аблегчалі-бы гаспадарам перавозку сельскіх прадуктаў;

е) каб быў зарганізаваны танны ды выгадны кораткатэрміны і доўгасрочны крэдыт;

ж) каб былі ўведзены дзяржаўныя страхоўкі ад пажараў, граду, пошэсьці жывога інвэнтара і інш. няшчасьцяў, якія валяцца на сельскага гаспадара;

з) каб сьцярогся лес і гэтым спынялася зьнішчэньне лесу, якога недахват так дужа цяпер адчуваецца;

і) каб былі засаджаны дрэвамі і выкарыстаны дзеля разьвіцьця гаспадаркі і працоўнага насяленьня адлогі, рэкі ўладжаны гэтак, каб не залівалі палёў, а былі добрымі воднымі шляхамі.

Пры гэтым:

а) разьмер наладжываемых калёній і разьмер, да якога будуць павялічывацца надта маленькія гаспадарствы, павінен быць дапасаваны да абшару, які прызнаецца ў данных умовах як неабходнае мінімум самастойнай сялянскай гаспадаркі.

Абшар гэты не павінен быць вялікшы за 25 маргоў;

б) у першай чарзе пры новаладжаных калёніях будуць: тыя, хто служыў у маёнтках і дзякуючы парцэляцыі застаўся бяз працы; гаспадары надта маленькіх гаспадарак; жаўнеры польскае арміі, варочаючыся пасьля вайны, беззямельныя, якія ня маюць ніякай прафэсыі і ня ўмеюць ніякага рамясла, але здольныя да сельскай працы. Павінна быць пры гэтым зьвернена ўвага на варочаючыхся з вайны жаўнераў і ваенных інвалідаў, а апроч таго трэба браць пад увагу лік зямлі патрэбнай для комасацыі і наладжэньня служэбнасьці

в) увесь абшар зямлі, прадназначаны дзеля прадажы ўласьнікам ужо цяпер самастойных гаспадарстваў ня можа быць вялікшы за 20 прац. (пятую частку) усіх парцэляваных абшараў, пры гэтым той, хто купляе, ня можа купіць больш за 40 маргоў зямлі разам з той, якую меў дагэтуль.

Уласьнікі самастойных гаспадарстваў, купляючы новыя кускі зямлі, павінны плаціць усю належнасьць паводле ацэнкі, а беззямельныя, калёністыя і гаспадары надта маленькіх гаспадарств, купляючы да нормы самастойнага гаспадарства, будуць магчы карыстацца доўгаерочным, амортызацыйным крэдытам.

У зьвязку з зямельнай рэформай і дзеля таго каб забяспечыць трываласьць нованаладжанага стану ўладаньня. Урад дае патрэбныя законы, якія перашкаджаюць перекруціць зямельную рэформу і не даюць магчымасьці вярнуцца да старых парадкаў. Асабліва павінны быць даны законы, якія забаранялі-бы рабіць прыватную парцэляцыю.

Дзеля таго, каб правесьці ў жыцьцё і узмацаваць зямельную рэформу згодна з вышэй памя-

нёнымі асновамі, трэба ўтварыць Галоўны Зямельны Урад, якога мэтай будзе:

а) грамаджэньне запасаў зямлі дзеля калёнізацыі вышэйпамянёным спосабам;

б) дапамагаць уласьнікам нованаладжаных гаспадарак устроіцца на іх, а калёністым, якія пераменяюць сялібы, перанесьціся і наладзіць гаспадарку на новым месцы.

Галоўны Зямельны Урад будзе мець права выпушчаць дзяржаўную зямельную рэнту, абапёртую на занятых абшарах зямлі, а рэнтавыя паперы будуць ягоным спосабам расплаты.

Разам з Галоўным Зямельным Урадам будзе ўтвораны Дзяржаўны Зямельны Банк, якога мэтай будзе кіраваць спосабамі фінансаваньня мэліорацыйнай, парцэляцыйнай і калёнізацыйнай дзеяльнасьці, дапамагаць калёністым і тым, хто купляе грунтавыя дзелібы, адтрымаць крэдыт, а так-сама падтрымоўваць неспэкулянцкія арганізацыі, якія займаюцца дастаўкай інвэнтару і матэрыялаў, патрэбных дзеля будаваньня і наладжэньня гаспадаркі ў новых сялібах.

Маральныя указы.

48. P. S. L. „Wyzwolenie“ сваю моц апірае ня толькі на ліку сваіх сяброў, але і на маральнай вартасьці людзей, якія складаюць тую шчыльную грамаду, каторая йдзе згодна, бязупынна і рашуча да супольнай дарагой мэты.

49. P. S. L. „Wyzwolenie“ стаіць на грунце поўнае веры, што істнаваньне і разьвіцьце польскае дзержавы залежаць ад каханьня свабоды, павагі законаў і грамадзкай роўнасьці ўсіх грамадзян гэтае дзяржавы.

1964 г.

50. Узмацоўваньне маральных сіл народу P. S. L. „Wyzwolenie“ лічыць самым важным, каб утрымаць здабытую незалежнасьць.

51. Змаганьне з уселякай крыўдай, якая мае свой пачатак у грамадзкай няроўнасьці — ўвядзеньне ў жыцьцё прынцыпаў безумоўнай справядлівасьці — дамаганьне, каб усе грамадзяне Польшчы былі роўнапраўнымі у аднашэньні да навукі, мастацтва і культуры — лічым нашым маральным абавязкам.

52. Лічучы свабоду самым дарагім скарбам чалавека і веручы вартасьці цэннасьцяў уласнай душы — прызнаем бязумоўнае права ўсіх людзей, якія хочуць самастойна разьвіцца, да вольнага нацыянальнага разьвіцьця.

53. Ідучы да поўнага пераходу дзяржаўнае ўлады ў рукі народу — мы аднача́сна стараемся, каб у прыватных, публічных і міжнародных адносінах запанавалі праўда і чэснасьць.

54. Шчырым народнікам „Wyzwolenie“ прызнаем толькі таго, хто ў прыватным жыцьці лічыць сваім бязумоўным маральным законам: цьвярозасьць, праўдзівасьць, чэснасьць, гатоўнасьць да службы для Бацькаўшчыны, вытрываласьць у барацьбе за справядлівасьць, ахвярнасьць для кожнай добрай справы.

55. Праўдзівасьць і чэснасьць хочам так-сама ўвесьці і ў жыцьцё палітычнае, якое цяпер апаганена перакупствам, інтрыгай і карьерай.

Бел. аддзел
1994 г.

B0000003135183